МГПУ им. И.П.Шамякина

## ТЭКСТЫ-ЎВАСАБЛЕННІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

***Сугак К. В.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– В. Я. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт*

У апошнія дзесяцігоддзі актыўна распрацоўваецца і ўдакладняецца лінгвістычная тэорыя тропаў і фігур (Н. Д. Аруцюнава, В. Д. Старычонак,

В. А. Ляшчынская, А. А. Станкевіч, А. І. Равуцкі, С. Б. Кураш і інш.). Цікавасць выклікае увасабленне (грэч. prosopopoieia, ад prosopon – асоба + poieo – раблю) – надзяленне неадушаўлёных прадметаў прыкметамі і ўласцівасцямі жывых істот [1, 241] (у суадносінах з разуменнем антычных рыторык, служыць для таго, каб "напаўняць жыццём безжыццёвыя рэчы"). Дадзены троп заслужана лічыцца адным з самых распаўсюджаных ў літаратурным маўленні: яго вытокі бяруць свой пачатак яшчэ ў традыцыях вуснай народнай творчасці.

Увасабленне традыцыйна выкарыстоўваюць сучасныя паэты ў апісаннях прыроды, навакольнага свету, прадметаў, што акружаюць чалавека, з мэтай надання ім магчымасці адчуваць, думаць, дзейнічаць.

У адлюстраванні прыродных рэалій найбольш распаўсюджаны прэдыкаты, звязаныя з паняццямі, якія характарызуюць **знешнасць** чалавека: *Ах, **вярба** мая, вярба, вербачка, вярбінка! / Ах якая ж у цябе зялёная хусцінка!* (П. Броўка). *Вечалле, / Вечалле / Азаронае, / Павянчана з вечарам / **Азяро** маё. / Ручніком зялёненькім Бору вязана, / Зорамі залётнымі / Лісце вязава.* (У. Лісіцын); *На берагах былінных Свіцязі, / Спавіўшы хмарамі чубы, / Стаяць, як казачныя віцязі, / Шыракаплечыя **дубы*** (П. Макаль).

Стан прыродных з'яў і аб'ектаў выяўляецца з дапамогай метафар-увасабленняў з адпаведным значэннем: *Перад тым, / Як у мора бязмежнае выйсці, / **Раку** пачалі / Сумненні грызці. / Ахапіла / Шчымлівае пачуццё: / А ці так працякло / Жыццё?* (П. Макаль); *У шубу цёплую адзета, / У садзе **яблыня** стаіць. / Яна стамілася за лета, / Напрацавалася і спіць. / Не чуе песенькі сініцы, / Не чуе гоману вятроў* (Э. Агняцвет).

Даволі часта ў паэтычных творах неадушаўлёныя прадметы "ажываюць" таму, што аўтар уяўляе дзеянні гэтых прадметаў як учынкі людзей: ***Лівень** з радасцю шчырай / Наляцеў на палі, / Басаногі задзіра, / Ён скакаў па зямлі. / Лівень падаў імклівы, / Адчуваў ён і сам, / Як патрэбен ён нівам, / Каласам і лясам* (Э. Агняцвет).

Такім чынам, аналіз тэкставага матэрыялу паказаў, што прыём увасаблення, які рэалізуецца на ўзроўні цэлых паэтычных тэкстаў, носіць дастаткова сістэмны і мадэліраваны характар.

**Літаратура**

1. Розенталь, Д. В. Словарь-справочник лингвистических терминов: пособие для учителя / Д. В. Розенталь, М. А. Теленкова. – М.: Просвящение, 1985. – 399 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина